САЦЫЯЛЬНЫ РАКУРС
ДОНАРЫ — ЛЮДЗІ АСАБЛІВЫЯ 3 стар.
ДЫПКУР'ЕР
*56-я СЕСІЯ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН* 3 стар.
ЗДАРЭННІ
ХЛОПЧЫКА ВЫРАТАВАЎ СУСЕД 2 стар.





ХРЫСЦІЯНСКАЯ СТАРОНКА "ЖЫЦЦЁ І ВЕРА" 5 стар.
ПРЭЗЕНТАЦЫЯ
"ЗЕМЛЯ З БЛАКІТНЫМІ ВАЧЫМА" 4 стар.
БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ
*ЗНАЁМСТВА З Пятром ЮШЧУКОМ* 6 стар.
ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ: ІЗРАІЛЬ, УКРАІНА 6 стар.





ВАНДРОЎКА
*БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА* 8 стар.
ЖЫЦЦЁВЫЯ СЮЖЭТЫ
*НАСТАЎНІЦА З-ПАД НЯСВІЖА* 7 стар.
КРЫЖАВАНКА
АД Алега КУЛЬЧЫЦКАГА 8 стар.





**АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА** **РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ**

# Голас Радзімы

22 жніўня 2001 года
Цана 112 рублёў

№ 34 (2748)
E-mail: golas_radzimy@tut.by

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі
Выдаецца з 6 красавіка 1955 года




## ДАЖЫНКІ

Агракамбінат "Ждановічы", які знаходзіцца ў прыгарадзе беларускай сталіцы, першым на Міншчыне сабраў ураджай збожжавых. На плошчы ў тысячу гектараў намалочана 5,2 тысячы тон зерня. У гаспадарцы ўжо адбылося традыцыйнае свята "Дажынкі-2001".

Гэтае свята — "першая ластаўка" ў вобласці. Упершыню на ждановіцкіх дажынках кожны з дзевяці лепшых экіпажаў камбайнераў атрымаў прэмію Мінскага выканаўчага камітэта ў памеры аднаго мільёна рублёў.

НА ЗДЫМКАХ: каравай новага ўраджаю — удзельнікам свята; уручэнне каштоўнага падарунка пераможцу Сяргею МАЛАШКЕВІЧУ.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БелТА.



ДЗЯРЖАВА І РЭЛІГІЯ

**Аляксандр БІЛЫК, старшыня Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь:**

## «ЗАХОЎВАЕМ РАЎНАВАГУ ІНТАРЭСАЎ»

### ДЗЯРЖАЎНЫМ ОРГАНАМ ПА СПРАВАХ РЭЛІГІЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 16 ЖНІЎНЯ 2001 ГОДА СПОЎНІЛАСЯ 10 ГАДОЎ

Працяг тэмы на 2-й стар.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ХВАРОБА АДСТУПАЕ

**Міжнародны Чырвоны Крыж мае намер развіваць далейшае супрацоўніцтва з урадам Беларусі па праграмах барацьбы з туберкулёзам. Пра гэта паведаміла кіраўнік сакратарыята па краінах СНД Гражына САНСЕЛ.**

Ацэньваючы візіт дэлегацыі Міжнароднага Чырвонага Крыжа ў Беларусь з мэтаю аказання дапамогі хворым, Г. Сансел адзначыла, што ў рэспубліцы "ёсць вялікі чалавечы, а таксама пэўны матэрыяльны патэнцыял па барацьбе з туберкулёзам". Яна таксама паведаміла, што Еўрапейская камісія выдзеліла Беларускаму Чырвонаму Крыжу новы грант каля 2 мільёнаў еўра, што складае каля 2,5 мільярда беларускіх рублёў.

Аналізуючы сітуацыю, прадстаўнік Чырвонага Крыжа адзначыла, што ў апошнія два гады ў краіне акрэслілася пэўнае зніжэнне тэмпаў распаўсюджвання гэтага захворвання. "Даны паказчык адлюстроўвае стабільнасць дзяржавы, якая больш увагі пачала надаваць лячэнню хворых", — заявіла Г. Сансел.

**Алена РУДЗЬ.**

ВЫБАРЫ

## КАНДЫДАТЫ НАЗВАНЫ

*ПАСВЕДЧАННІ КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ АТРЫМАЛІ Сяргей ГАЙДУКЕВІЧ, Уладзімір ГАНЧАРЫК, Сямён ДОМАШ, Аляксандр ЛУКАШЭНКА.*



*НА ЗДЫМКУ: члены Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў аднадушна прагаласавалі за зацвярджэнне статуса кожнага з 4-х прэтэндэнтаў.*

Працяг тэмы на 2-й стар.

СПОРТ

## ПЕРАМАГАЮЦЬ ТОЛЬКІ ЖАНЧЫНЫ?

**Адзін залаты і тры сярэбраныя медалі прывезлі беларускія лёгкаатлеты з VIII чэмпіяната свету па лёгкай атлетыцы, які праходзіў у Эдмантане (Канада). Вынік, трэба прызнаць, выдатны, асабліва, калі ўлічыць той факт, што на мінулым першынстве ні аднаму з нашых спартсменаў не ўдалося падняцца на п'едэстал.**

Героямі чэмпіяната сталі: Яніна Карольчык (ядро), Наталля Сазановіч (сямібор'е), Валянціна Цыбульская (спартыўная хадзьба) і Эліна Зверава (дыск).

Ужо першы дзень сусветных спаборніцтваў прынёс нам добрую вестку: Яніна Карольчык даказала, што яна мацнейшая ў свеце, штурхнуўшы ядро на 19,87 метра яшчэ ў кваліфікацыйнай спробе. Але Яна не спынілася на гэтым: фінальны кідок стаў нацыянальным рэкордам — 20,61!

Прымусіла пахвалявацца балельшчыкаў Наталля Сазановіч, якая атрымала жаданае "серабро". На працягу спаборніцтваў спартсменка пабывала і ў першых радах, і далёка не ў пачатку спісу лепшых, але ў выніковым пратаколе ўсё ж такі трывала замацавалася на другой пазіцыі.

Нашы спартсмены трымалі сваіх балельшчыкаў у напружанні: медалі атрымалі толькі ў першыя і апошнія дні.

На заключным этапе чэмпіянату Валянціна Цыбульская, якая спаборнічала ў спартыўнай хадзьбе на 20 кіламетраў — адным з самых прэстыжных відаў лёгкай атлетыкі, фінішавала другой з вынікам 1:28,49, прапусціўшы наперад толькі расіянку Вольгу Іванову — 1 : 27,48.



*Яніна КАРОЛЬЧЫК.*

Пацвердзіла, што ёй яшчэ рана развітвацца з вялікім спортам, алімпійская чэмпіёнка Эліна Зверава. Яна стала сярэбраным прызёрам першынства свету.

Такім чынам, з 26 мацнейшых прадстаўнікоў лёгкай атлетыкі Беларусі, якія ўдзельнічалі ў чэмпіянаце свету, на перамогу аказаліся здольнымі толькі жанчыны.

Дарэчы, Дзмітрый Маркаў, які выступаў раней за Беларусь, выйграў турнір прыгуноў з шостам. Але цяпер ён прадстаўляе Аўстралію.

Увогуле, узнагароды чэмпіянату атрымалі спартсмены 42 краін са 192, чые каманды прынялі ўдзел у спаборніцтве. Беларуская каманда на 11-м месцы.

**Аксана РАБУХІНА.**

* NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOSCI * NOTICIAS DE BELARU SNEWS * NEWS FROM BELARUS *

ВЫБАРЫ

# КАНДЫДАТЫ Ў ПРЭЗІДЭНТЫ НАЗВАНЫ

***14 ЖНІЎНЯ Ў ПАЛАЦЫ РЭСПУБЛІКІ Ў МІНСКУ НА ПАСЯДЖЭННІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ВЫБАРАХ І ПРАВЯДЗЕННЮ РЭСПУБЛІКАНСКІХ РЭФЕРЭНДУМАЎ БЫЛІ НАЗВАНЫ ЧАТЫРЫ КАНДЫДАТЫ НА ПОСТ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ.***

Згодна з данымі Цэнтрвыбаркама, прэтэндэнты сабралі ў сваю падтрымку наступную колькасць галасоў: Аляксандр Лукашэнка — 395 821; Сямён Домаш — 160 077; Сяргей Гайдукевіч — 133 066; Уладзімір Ганчарык — 121 041.

Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына ўручыла кандыдатам у прэзідэнты адпаведныя пасведчанні.

Пасля афіцыйнай рэгістрацыі кандыдаты атрымалі магчымасць выступіць. Кожны выказаў удзячнасць тым, хто падтрымаў яго ў час вылучэння.

На пасяджэнні ЦВК прысутнічалі кіраўнікі ініцыятыўных груп прэтэндэнтаў, прадстаўнікі тэрытарыяльных выбарчых камісій, кіраўнікі ўрада і Нацыянальнага сходу, старшыні Канстытуцыйнага, Вярхоўнага судоў, назіральнікі і інш.







НА ЗДЫМКАХ: Сямён ДОМАШ і Аляксандр ЛУКАШЭНКА; пасведчанне атрымлівае Уладзімір ГАНЧАРЫК; Сяргей ГАЙДУКЕВІЧ.

Фота БелТА.

ДЗЯРЖАВА І РЭЛІГІЯ



*Аляксандр БІЛЫК:*

# «ЗАХОЎВАЕМ РАЎНАВАГУ ІНТАРЭСАЎ»

***АБ АДНЫМ З АСНОЎНЫХ НАКІРУНКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯРЖКАМІТЭТА ПА СПРАВАХ РЭЛІГІЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ РАСКАЗВАЕ ЯГО СТАРШЫНЯ — АЛЯКСАНДР БІЛЫК***

Гісторыя органаў па справах рэлігій нашай рэспублікі супадае з гісторыяй станаўлення і развіццём беларускай суверэннай дзяржаўнасці. Да красавіка 1991 года сфера дзяржаўна-царкоўных узаемадачыненняў адносілася да кампетэнцыі Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР. У рэспубліках, краях і абласцях гэты саюзны орган меў сваіх упаўнаважаных па справах рэлігій з невялікім апаратам спецыялістаў.

У гэтых умовах 1 кастрычніка 1990 года Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях". У сваю чаргу Вярхоўны Савет Расійскай Федэрацыі 25 кастрычніка 1990 года прыняў Закон "Аб свабодзе веравызнанняў".

Пад уплывам азначаных абставін 26 красавіка 1991 года Кабінет Міністраў СССР прыняў Пастанову № 209, якой скасаваў інстытут упаўнаважаных Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР. Гэты дакумент з'явіўся прававой падставай для Савета Міністраў БССР прыняць пастанову № 318 ад 16 жніўня 1991 года "Аб стварэнні ў рэспубліцы дзяржаўных органаў па справах рэлігій", згодна з якой быў створаны Савет па справах рэлігій пры Савеце Міністраў БССР, зацверджана яго калегія ў складзе 5 чалавек, а таксама рэкамендавана аблвыканкамам стварыць часовыя структурныя падраздзяленні для выканання функцый, прадугледжаных законам "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях". Прававы статус і кампетэнцыя Савета законам былі вызначаны як інфармацыйны, кансультацыйны і экспертны цэнтр. З гэтымі абмежаванымі функцыямі Савет дзейнічаў да 1997 года.

Супрацоўнікамі Савета быў распрацаваны праект Закона Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях", прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 17 снежня 1992 года. За ўсю гісторыю краіны гэта быў першы закон аб дзяржаўна-царкоўных адносінах.

Між тым, рэлігійнае жыццё ў Беларусі перажывала адраджэнне. Калі на пачатак 1991 года ў рэспубліцы дзейнічалі 1 153 рэлігійныя абшчыны васьмі канфесій, то ў 1996 годзе колькасць рэлігійных абшчын узрасла да 2 120. Яны прадстаўлялі 26 канфесій.

Рэлігійная сітуацыя патрабавала павышэння статуса і пашырэння функцый дзяржаўнага органа па справах рэлігій.

11 студзеня 1997 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка выдаў Указ № 30 "Аб сістэме рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь". Гэтым актам быў створаны Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь.

Урадам рэспублікі на Дзяржкамітэт ускладзены вельмі важныя і адказныя задачы:

— садзейнічаць гарманічнаму духоўнаму развіццю грамадзян Рэспублікі Беларусь, захаванню і паглыбленню традыцый узаемапаразумення і ўзаемацярпімасці ўсіх нацыянальных супольнасцей і рэлігійных канфесій;

— даследаваць і прагназаваць рэлігійную і этнасацыяльную сітуацыю;

— арганізаваць кантроль за выкананнем актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь па накірунках дзейнасці;

— садзейнічаць рэалізацыі правоў грамадзян розных нацыянальнасцей у сферах культуры, адукацыі, мовы;

— садзейнічаць і непасрэдна дапамагаць у задавальненні нацыянальна-культурных патрэб беларусаў, што пражываюць за мяжой, умацоўваць іх сувязі з Рэспублікай Беларусь.

У абласцях гэтыя задачы вырашаюць Саветы па справах рэлігій і нацыянальнасцей аблвыканкамаў, у Мінску і Мінскай вобласці — адпаведныя аддзелы гарвыканкама і аблвыканкама.

Наш камітэт невялікі, колькасць супрацоўнікаў — 14 чалавек, але ў рэалізацыі задач, якія стаяць перад ім, удзельнічаюць многія іншыя спецыялісты. Яны на дабрачынных пачатках працуюць у грамадскіх камісіях садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб свабодзе веравызнанняў, створаных пры гарвыканкамах і райвыканкамах. Дзякуючы гэтаму ў Беларусі захоўваецца спакойная міжнацыянальная і міжканфесійная сітуацыя, забяспечваюцца правы грамадзян на аб'яднанне ў рэлігійныя і нацыянальна-культурныя арганізацыі і іх дзейнасць. Арганізавана і на высокім узроўні прайшло святкаванне 2000-годдзя хрысціянства.

У цяперашні час у краіне дзейнічаюць 2 663 рэлігійныя абшчыны, якія прадстаўляюць 26 канфесій. Найбольш распаўсюджанымі рэлігіямі з'яўляюцца праваслаўе — больш за 1 180 абшчын і каталіцызм — больш за 420 абшчын. Рэлігійнымі аб'яднаннямі створаны 13 духоўных навучальных устаноў, 14 рэлігійных брацтваў і 8 сястрыцтваў, 23 місіі і 8 дабрачынных таварыстваў. За ўказаны перыяд рэлігійнымі арганізацыямі пабудаваны 1 864 культавыя будынкі. Значна пашырылася сфера дзейнасці рэлігійных арганізацый. Акрамя культавай практыкі, яны займаюцца дабрачыннасцю, рэлігійнай асветай і адукацыяй, усталёўваюць і падтрымліваюць міжнародныя сувязі, займаюцца выданнем і распаўсюджаннем рэлігійнай літаратуры, газет і часопісаў і г. д.

ЗДАРЭННІ

## ВЫРАТАВАЎ СУСЕД

Браты Віктар і Дзіма вырашылі пагуляць у хованкі на адной з вуліц Добруша, што ў Гомельскай вобласці. Калі двухгадовы Віктар зваліўся ў калодзеж, старэйшы Дзіма пабег да суседа Івана Рудзянкова. У лічаныя хвіліны той зразумеў, што трэба рабіць, і хлопчык быў выратаваны. Так Іван Рудзянкоў, работнік Добрушскай папяровай фабрыкі, стаў яго хросным бацькам.

НА ЗДЫМКУ: Іван РУДЗЯНКОЎ разам з братамі каля злашчаснага калодзежа.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БелТА.



ЗЕМЛЯКІ




Наш зямляк касманаўт, двойчы герой Савецкага Саюза, начальнік Вышэйшай ваеннай акадэміі імя Жукоўскага ў Маскве генерал-палкоўнік авіяцыі Уладзімір КАВАЛЁНАК (на здымку другі справа) у гасцях у рабочых аб'яднання "Дываны Брэста".

Фота БелТА.

АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ

# ДОНАРЫ — ЛЮДЗІ АСАБЛІВЫЯ

## ШТОГОД У НАШАЙ КРАІНЕ БЯРУЦЬ ПАЎМІЛЬЁНА ДОЗ ДОНАРСКАЙ КРЫВІ

*Хто здае кроў? У большасці сваёй мужчыны, хаця супрацоўнікі Рэспубліканскай станцыі пералівання крыві апошнім часам заўважаюць тэндэнцыю да павелічэння колькасці жанчын. Ёсць людзі, якія здаюць кроў так часта, як толькі дазваляе здароўе і медыцынскія нарматывы. Многія з іх згаджаюцца на гэта, зыходзячы з перакакання ў неабходнасці справы. Малады чалавек, з якім мне давялося паразмаўляць на станцыі, ужо працяглы тэрмін пастаянна здае кроў. Леанід разумее, што яго ная кроў ідзе на высакародныя мэты, але спадзяецца, што дапамагае выратоўваць менавіта жанчын пасля цяжкіх родаў. Дарэчы, ён сцвярджае, што з часам адчуваецца патрэбнасць арганізма ў абнаўленні крыві. Леанід займаецца спортам ды, наогул, імкнецца весці здаровы лад жыцця.*

*Донар вызваляецца ад працы ў дзень здачы крыві. Акрамя таго, яму выплачваецца грашовая кампенсацыя — 11 115 рублёў. Гэта не вельмі вялікая сума, асабліва калі чалавек губляе заробак за дзень. Донары нават жартуюць, што ім плацяць толькі за прапушчаныя працоўныя гадзіны, а кроў яны аддаюць бясплатна, за ідэю. Дарэчы, працэдура займае нямала часу, асабліва калі здаеш плазму: аналізы, медагляд, сама здача крыві. Нягледзячы на папярэдні запіс, утвараюцца чэргі.*

*Галоўны клопат медыкаў — бяспека донараў, персанала і пацыентаў, якія будуць карыстацца крывёю ці яе прадуктамі, сцвярджае галоўны урач Рэспубліканскай станцыі пералівання крыві Валерый БАНДАРЭНКА:*

— Персанал дастаткова абаронены. Усё неабходнае для выканання правіл бяспекі пры працы з крывёю ёсць. І калі чалавек дасканала выконвае свае абавязкі, ён рызыкуе заразіцца праз кроў не больш за любога іншага медыцынскага работніка. Не буду скрываць, былі выпадкі, калі людзі інфіцыраваліся вірусам гепатыту быццам бы на працы. Але гэта цяжка даказаць ці, наадварот, абвергнуць.

Дзякуючы выкарыстанню толькі аднаразовых інструментаў, донары могуць не турбавацца за сваё здароўе. Ёсць іншая праблема, што турбуе сусветную медыцынскую грамадскасць. Я маю на ўвазе наяўнасць так званага серанегатыўнага акна. Справа ў тым, што заўсёды існуе рызыка не выявіць прысутнасць інфекцыі ў крыві донара на ранняй стадыі захворвання. Чалавек можа здаваць кроў, калі ён, да прыкладу, ВІЧ-інфіцыраваны. Не выключана, што ягоны арганізм яшчэ не пачаў выпрацоўваць антыцелы. А менавіта тэсціраваннем на знаходжанне антыцелаў мы і займаемся, калі робім аналіз на гепатыт, ВІЧ.

Хочацца падкрэсліць, што мы выкарыстоўваем сучасныя тэст-сістэмы чацвёртага пакалення. Дарэчы, большасць з іх не айчыннай вытворчасці. Імкнемся, наколькі дазваляюць сродкі, набываць лепшае за мяжой. А кроў правяраецца на наяўнасць ВІЧ-інфекцыі, венерычных захворванняў, гепатыту тыпу В, С.

**— Мабыць, такія мерапрыемствы каштуюць нятанна!**

— Мяркуйце самі: у разліку на адну пробу крыві дыягностыка на ВІЧ абыходзіцца дзяржаве 1,2 долара ЗША, гепатытаў В — 1,2; С — 2,7. Але каб меркаваць, дорага гэта ці не, неабходна ўлічваць наступнае. Калі інфекцыя не заўважана, хваробай могуць заразіцца мінімум 3 чалавекі. Пра максімум я ўжо і не кажу. Лячэнне і ўтрыманне аднаго ВІЧ-інфіцыраванага каштуе 5 тысяч долараў ЗША ў год.

**— Якія захады здзяйсняюцца сёння для захавання бяспекі донарскай крыві!**

— Паколькі хвароба можа не праяўляць сябе 2—6 месяцаў, мае сэнс на працягу гэтага тэрміну не выкарыстоўваць кроў, а захоўваць плазму ў замарожаным стане. Пры гэтым яе якасць не пагаршаецца. Нядаўна мы набылі 100 маразільных камер, частку якіх ужо адправілі ў небяспечныя ў сэнсе ВІЧ-інфекцыі рэгіёны краіны — Гомельскую вобласць, усход Брэсцкай і захад Магілёўскай.

**— Як вырашаецца гэтая праблема ў свеце!**

— Цяпер ва ўсіх развітых краінах ідзе гаворка пра барацьбу з неабгрунтаванымі пераліваннямі крыві. Мы таксама працуем у гэтым накірунку, бо на Беларусі кроў пераліваюць занадта часта і не заўсёды па жыццёвых паказчыках. Летась, напрыклад, было выкарыстана 50 тысяч літраў плазмы, зрабілі каля 250 тысяч пераліванняў. Каля трэці з іх можна было б пазбегнуць. На жаль, урачы бальніц, сутыкаючыся з недахопам лекаў, часам вымушаны выкарыстоўваць для падтрымкі хворага донарскую плазму. Цяпер праводзяцца розныя праверкі і кантралюецца, наколькі магчыма, працэс.

У свеце ёсць практыка вірусаінактывацыі прэпаратаў крыві. Гэта досыць надзейны метад абеззаражвання. Але каб рабіць такое на Беларусі, трэба стварыць спецыялізаванае прадпрыемства. Для інфармацыі: у Кітаі пабудаваны трэці ў свеце завод, які перарабляе 2 400 тон плазмы штогод. Нам будзе дастаткова перарабляць штогод 100 тон плазмы крыві.

З сакавіка мы займаемся пытаннем стварэння такога прадпрыемства на Беларусі. Знайшлі замежнага інвестара. Паколькі будаўніцтва будзе каштаваць каля 40 мільёнаў долараў, на Беларусі інвестара знайсці немагчыма. Завод пачне даваць прыбытак праз 4—5 гадоў, і яго рэнтабельнасць складзе 400 працэнтаў. Праўда, такое магчыма, калі прадаваць частку прадукцыі (для самой Беларусі хопіць 75 тон плазмы), што забаронена Законам аб донарстве 1995 года. Цяпер разглядаецца магчымасць унясення змяненняў у закон.

Гэта дазволіць дзяржаўным прадпрыемствам экспарт крыві і яе прадуктаў пасля задавальнення патрэб нашай краіны з дазволу Міністэрства аховы здароўя. У такім выпадку прыйдзецца арганізоўваць адпаведную структуру. Калі з'явяцца рэальныя перспектывы стварэння прадпрыемства, мы гэта зробім. Бізнесплан яго будаўніцтва ўжо знаходзіцца ў Савеце Міністраў. Я вельмі спадзяюся ўбачыць пры сваім жыцці такое прадпрыемства на Беларусі.

**— Час ад часу па радыё і тэлебачанні гучыць інфармацыя накшталт: "Тэрмінова патрабуецца кроў для пералівання"...**

— Я не магу растлумачыць, адкуль бяруцца такія аб'явы. На Беларусі дастаткова донарскай крыві і яе прадуктаў. Станцыі пералівання ёсць па ўсёй краіне. Я разумею, што ў правінцыі бываюць складанасці з палівам для аўтамабіляў, каб прывезці кроў, і гэтак далей. Аднак наша экспедыцыя працуе круглыя суткі, кроў можна заказаць кожны дзень. Калі прыходзіць донар, так бы мовіць, з вуліцы, рызыка заражэння інфекцыйнымі хваробамі ўзрастае ў некалькі разоў.

**— Вы гаворыце, што на Беларусі хапае донарскай крыві. Ці не дзіўна, што ў наш неспакойны час ёсць шмат людзей, якіх турбуе лёс іншых!**

— Сапраўдныя донары — людзі асаблівыя. Некаторыя з іх здаюць кроў на працягу 20—30 гадоў. Зразумела, ніхто не адмовіцца ад грошай, якія яму прапаноўваюць. Але ж у пачатку 90-х гадоў за здачу крыві плацілі амаль сімвалічна, аднак донарства захавалася.

**Алена СПАСЮК.**

ДЫПКУР'ЕР

# 56-я СЕСІЯ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН

**11 верасня 2001 года ў Нью-Йорку распачне сваю работу чарговая, 56-я сесія Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.**

**Удзел Рэспублікі Беларусь у згаданым форуме традыцыйна з'яўляецца адной з галоўных знешнепалітычных падзей года.**

56-я сесія Генеральнай Асамблеі — своеасаблівы працяг Саміта тысячагоддзя. На ёй будуць падводзіцца першыя вынікі рэалізацыі палажэнняў Дэкларацыі тысячагоддзя і вызначацца новыя задачы перад супольнасцю нацый. Важнай падзеяй напярэдадні правядзення 56-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН стала перавыбранне на другі тэрмін Генеральнага сакратара арганізацыі Кофі Аннана. Адно з цэнтральных мерапрыемстваў сесіі — агульнапалітычная дыскусія з 24 верасня па 5 кастрычніка. Другога кастрычніка ў рамках правядзення дыскусіі плануецца выступленне кіраўніка дэлегацыі Рэспублікі Беларусь з выкладаннем пазіцыі нашай краіны па шэрагу актуальных міжнародных пытанняў.

56-ы форум ААН з'яўляецца вельмі важным і адказным для нашай краіны: Беларусь вылучыла сваю кандыдатуру ў непастаянныя члены Савета Бяспекі ААН на перыяд 2002—2003 гадоў. Сёння ідзе напружаная праца па падрыхтоўцы да выбараў, на якіх нашым канкурэнтам выступіць Балгарыя.

Традыцыйна прыярытэтнымі сферамі інтарэсаў Беларусі на сесіі застануцца падтрымка міру і міжнароднай бяспекі, праблематыка ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, гуманітарныя пытанні і правы чалавека, шматпланавае рэфармаванне сістэмы ААН, прыродаахоўныя і адміністратыўна-бюджэтныя пытанні. Не менш значным для дэлегацыі Беларусі будзе "чарнобыльскае" пытанне, адстойванне неабходнасці аказання міжнароднай супольнасцю пастаяннай дапамогі Беларусі ў пераадоленні і мінімізацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС як найбольш пацярпелай краіне. У гэтым накірунку беларускі бок будзе дзейнічаць сумесна з Расіяй і Украінай. Улічваючы геапалітычнае становішча Беларусі, актуальнай застаецца актывізацыя ўзаемадзеяння з іншымі краінамі па пытаннях барацьбы з трансгранічнай злачыннасцю, незаконным абаротам наркотыкаў і міжнародным тэрарызмам. Беларусь чакае кансалідаваную падтрымку па згаданай праблематыцы з боку краін СНД.

У ходзе сесіі дэлегацыя Беларусі мае намер канцэнтраваць свае намаганні на пашырэнні супрацоўніцтва з эканамічнымі інстытутамі і органамі сістэмы ААН у мэтах прадаўжэння і павелічэння аб'ёмаў фінансава-тэхнічнай дапамогі. У прыватнасці, сумеснай рэалізацыі праграм рэгіянальнага супрацоўніцтва па лініі ПРААН. Беларусь з'яўляецца членам Руху недалучэння, і 56-я сесія Генасамблеі ААН — добрая магчымасць пашырэння ўзаемакарысных, рознабаковых адносін з краінамі-удзельніцамі згаданай арганізацыі.

Адной з прыярытэтных задач дэлегацыі Беларусі будзе падтрымка глабальнай стратэгічнай стабільнасці і існуючага рэжыму ядзернага нераспаўсюджання, а таксама прасоўванне ініцыятывы Рэспублікі Беларусь па стварэнню ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе прасторы, свабоднай ад ядзернай зброі.

Неабходна адзначыць, што 5 верасня ў Маскве адбудзецца Савет міністраў замежных спраў краін-удзельніц СНД, на якім адным з пытанняў парадку дня стане тэма будучай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

# ИТОГИ ВНЕШНЕЭКОНОМИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В ЯНВАРЕ – ИЮНЕ 2001 ГОДА

**Внешнеторговый оборот Беларуси сложился в фактических ценах в долларовом выражении в размере 7 339,1 миллиона долларов США и сократился по сравнению с январём—июнем 2000 года на 4,9 процента.**

**Товарооборот** со странами СНГ составил 4 817 миллионов долларов, или 65,6 процента общего товарооборота республики, с остальными странами — 2 522,1 миллиона долларов, или 34,4 процента общего товарооборота.

Стоимостный объем внешней торговли с государствами Содружества сократился на 2,7 процента, с государствами вне СНГ — на 8,7 процента. На сокращение внешнеторгового оборота страны повлияло значительное уменьшение импортных поставок.

**Экспортировано** Республикой Беларусь товаров на 3 668 миллионов долларов, в том числе в страны СНГ — на 2 198,5 миллиона долларов, из них в Россию — на 1 898,4 миллиона долларов; в государства вне СНГ — на 1 469,5 миллиона долларов. В целом в фактических ценах экспорт увеличился на 4,2 процента. В страны Содружества экспорт возрос на 6,9 процента, в том числе в Россию — на 9,7 процента. В страны вне СНГ белорусский экспорт увеличился на 0,3 процента.

На страны СНГ приходилось 59,9 процента белорусского экспорта, в том числе на Российскую Федерацию — 51,8 процента его общего объема.

**Общий объем** импорта составил 3 671,1 миллиона долларов, в том числе из стран СНГ — 2 618,5 миллиона долларов, из них из России — 2 447,5 миллиона долларов. Из государств вне СНГ импортировано товаров на 1 052,6 миллиона долларов.

*Внешняя торговля в первом полугодии текущего года характеризуется следующими тенденциями:*

*— разнонаправленностью динамики экспорта (+ 4,2 процента) и импорта (— 12,5 процента);*

*— уменьшением общего объема товарооборота (на 4,9 процента) в результате значительного сокращения (на 12,5 процента) импортных закупок;*

*— сокращением отрицательного сальдо в торговле с Российской Федерацией в 1,7 раза, или на 361,2 миллиона долларов;*

*— увеличением положительного сальдо в торговле со странами вне СНГ в 2,5 раза, или на 249,7 миллиона долларов;*

*— сокращением удельного веса бартерных операций в общем объеме экспорта.*

**Прэс-служба МЗС.**

ГАСЦЁЎНЯ

# БРАВА, СІБІРАКІ!



*У Мінску прайшлі гастролі Цюменскага дзяржаўнага тэатра драмы і камедыі, які ў гэтым годзе адыграў свой 143-ці сезон. Беларускаму гледачу былі прапанаваны спектаклі на ўсе густы. Гэта трагічны фарс "Забойства Ганзага", фантазіі балгарскага драматурга Нядзялка Йарданава пра тое, што было "за кадрам" шэкспіраўскага "Гамлета", камедыі "Кадрыль" Уладзіміра Гуркіна, "Школа зласлоўя" Рычарда Шэрыдана, "Вішневы сад" Антона Чэхава (менавіта "вішневы", з націскам на першы склад, што, са слоў галоўнага рэжысёра, прынцыпіяльна, бо, на яго думку, вішнёвы сад — гэта як бы паэтычная назва, а вішневы — гэта ўжо плод — вішня, якая прадаецца), музычная камедыя Карла Гальдоні "Мірандаліна", тургенеўскі "Нахлебнік", дзе вырашаецца пытанне, "якая ж цана спакою, што знаходзіцца на мяжы з абыякавасцю", і глыбока філасофская п'еса Пітэра Шэфера "Эквус", у якой побач высокая паэзія адносін і нізасць страсцей, дзе раскрываюцца тайны прыроды чалавечых учынкаў.*

*Галоўны рэжысёр Цюменскага тэатра — Аляксей ЛАРЫЧАЎ, выпускнік Казанскай акадэміі мастацтваў. Вучыўся ў Натана Басіна — аднаго з першых лаўрэатаў прэміі Станіслаўскага, заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі.*

*Два тыдні ў якасці госця Аляксей Іванавіч знаходзіўся ў Францыі, на Авіньёнскім фестывалі. Тры месяцы жыў у Амерыцы: праходзіў навучанне па псіхасінтэзу. У Галівудзе наведаў шэраг кінакампаній, займаўся ў вядомага псіхолага Роберта Рэера. Каля тыдня за праглядам рэпетыцый спектакляў правёў у Нью-Йорку. Усё гэта адлюстроўвае дыяпазон пошукаў Аляксея Ларычава, што і стала тэмай гутаркі.*

**— Аляксей Іванавіч, ці ўпершыню вы ў Беларусі!**

— Я быў у Мінску і Віцебску 12-гадовым хлапчуком. Тады ж наведаў Хатынь. Так што зараз гэта другі прыезд. Уражанне ад знаходжання ў Мінску самае прыемнае. У вас ёсць нейкая чалавечая злучанасць. Вельмі задаволены, што зноў апынуўся тут, таму што горад проста цудоўны і не толькі ў сэнсе архітэктуры, зеляніны, але і ў сэнсе асобай энергетыкі, якая выклікае жаданне кантактаў, зносін. Можа таму многія нашы спектаклі знайшлі разуменне ў гледача.

**— Дарэчы, якія ўражанні ад беларускага гледача!**

— Ён удумлівы, спакойны, не мітуслівы. Добры глядач. З ім прыемна размаўляць на мове тэатра.

**— Ці ёсць стасункі з Купалаўскім тэатрам, намер супрацоўнічаць!**

— У мінулым годзе гастраляваў у Цюмені Малы тэатр. Цудоўна яго прымалі. А з Купалаўскім тэатрам у нас ёсць праект супрацоўніцтва, але гэта толькі наметкі. Мне хацелася б паставіць адну з п'ес Аляксея Дударава ў Купалаўскім тэатры і ў нашым, а потым абмяняцца акцёрамі. Пакуль праект існуе толькі на словах, але тое, што ёсць агульная зацікаўленасць у яго ажыццяўленні, — гэта адназначна.

**— Мы жывём у розных краінах, і, пэўна, гэта ўскладняе рэалізацыю такога праекта.**

— Я так не думаю. Адзінае, што засталося ў Расіі і Беларусі, — тое, што належыць эксклюзіву, — гэта мастацтва, якога няма на Захадзе, якога няма ў Амерыцы. Мы можам гэтым ганарыцца. І ні ў якім выпадку не губляць, а тэндэнцыя такая, на жаль, існуе. Мы губляем рускую псіхалагічную школу. Ідзем у танцараспрананне, у весялосць у камедыях. Усё гэта сумна, таму што руская школа заўсёды славілася іншым. І беларуская таксама.

**— Як вы адносіцеся да мадэрнісцкіх плыняў у тэатральным мастацтве!**

— Усё павінна быць у меру. Ёсць цікавыя, добрыя навеўвядзенні, але нельга гэтым злоўжываць.

**— Хто ваш кумір сярод тэатральных рэжысёраў!**

— У мяне добрае стаўленне да Марка Захарава.

Цікава працуе Фаменка: рэжысёр і педагог — рэдкае спалучэнне. Ён займаецца складанай, хаця і надзвычай цікавай справай. За ёй будучыня, таму што акцёраў трэба гадаваць, як кветкі ў аранжарэі.

**— Таму і вы сталі займацца з моладдзю!**

— Для мяне гэта была неабходнасць: не хапала моладзі ў тэатры. Мы набралі 20 чалавек, з іх 19 выпусцілі. Дзесяцярых пакінулі ў сваім тэатры, а астатнія разышліся па іншых.

**— Што ўплывае на выбар рэпертуару! Вашы асабістыя творчыя прыхільнасці!**

— Паколькі мы з'яўляемся дзяржаўным тэатрам, то я глыбока перакананы, што рэпертуар павінен быць разнастайным, каб ён задавальняў усе слаі насельніцтва, а не толькі эліту. Гэта і акцёрам падпітка, і рэжысёрам. Таму мы часта выязджаем на гастролі, каб нашы акцёры бачылі іншыя тэатры. У мінулым годзе пабывалі з гастролямі ў Маскве. Даволі ўдала. Асабліва радасна было за нашу моладзь, якая трапіла на падмосткі Вахтангаўскага тэатра.

Асабіста я люблю на сцэне маўчанне і паўзы, калі глядацкая зала думае ў час цішыні на сцэне. Люблю філасофскія, псіхалагічныя прытчы. Хаця стараюся брацца за розныя спектаклі. Хочацца зразумець душу чалавека. Прычым не слабую, а моцную. Зразумець душу чалавека ў сувязі з той самай сістэмай маральных каштоўнасцей, каб быў гледачом нейкі прататып знойдзены. Сёння герояў у нас няма, на жаль, ні ў драматургіі, ні ў літаратуры. А таму і бяруць старыя п'есы, дзе ёсць такія героі. Хочацца даць гледачу адчуванне, што ёсць сэнс быць такім, а не іншым. Асабіста мяне цікавяць героі тыпу Пячорына, калі ёсць супярэчнасці ў характары. Натуры, якія пастаянна ў пошуку, незаспакоеныя.

**— Ваша творчая мара!**

— Паколькі я лічу, што тэатр — гэта маленькая мадэль свету, спрабую змяніць яго (тэатр) да лепшага. І калі людзі з задавальненнем будуць выходзіць на падмосткі, рабіць, што хочуць, і ездзіць на гастролі, куды хочуць, без аглядкі на фінансавыя цяжкасці, калі гэта здарыцца, я скажу: так, жыццё пражыта не дарэмна.

**— І ўсё ж, якія планы на бліжэйшую будучыню!**

— Я чалавек забабонны, таму назаву толькі аўтараў — Чэхаў, Астроўскі. Хачу зрабіць спектакль паводле аповесці "Герой нашага часу" Лермантава.

**— Тое, што чакалі ад гастролей у Мінску, спраўдзілася!**

— Думаю, так. Акцёры атрымалі творчы запал. Калі спектаклі на гастролях праходзяць з поспехам, гэта надае веры ў сябе, бо жыццё ж складанае.

**— Што ж, закончу нашу гутарку словамі адной мінскай глядачкі: "Брава, сібіракі! Прыязджайце да нас яшчэ!"**

Гутарыла
**Святлана КАРПУЧОК.**

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ




**НЯДАЎНА Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ ЛІТАРАТУРНЫМ МУЗЕІ ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА АДБЫЛАСЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ КНІГІ РАЗАЛІІ АЛЕКСАНДРОВІЧ І ТАЦЦЯНЫ НЕСКАРОМНАЙ "ЗЯМЛЯ З БЛАКІТНЫМІ ВАЧЫМА". З'ЯВА ДЛЯ МУЗЕЯ НЕБУДЗЁННАЯ: МЕРАПРЫЕМСТВЫ З ВЫПАДКУ НОВЫХ ВЫДАННЯЎ, ПРЫНАМСІ ТЫХ, ШТО ПРЫЗНАЧАНЫ САМЫМ МАЛЕНЬКІМ, ТУТ ЛАДЗЯЦЦА НЕ ТАК ЧАСТА.**

Усё адбывалася на эмацыянальна-кранальным узроўні. Запеўнае слова сказаў навуковец Леанід Лыч. Гаварыў грунтоўна і цікава, увязваючы змест кнігі з патрэбамі нацыянальнага выхавання новага пакалення беларусаў. Бо нельга быць бязадрасным грамадзянінам, а тым больш патрыётам.

На свяце кнігі ў Коласавым доме прысутнічала Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турцыі ў Рэспубліцы Беларусь спадарыня Шуле Сайсал. Яна выказала шкадаванне, што за час свайго побыту тут не авалодала дасканала беларускай мовай, каб свабодна чытаць і размаўляць, але кніга якраз ёй імпануе імкненнем прывіваць маленькім грамадзянам веды і любоў да зямлі з блакітнымі вачыма. Тым больш, што адзін з аўтараў, Разалія Александровіч, па нацыянальнасці не беларуска, а татарка. Але ж яе продкі пасяліліся тут яшчэ ў часы Вітаўта Вялікага, верай і праўдай служылі гэтаму магутнаму ўладару і ягоным нашчадкам, баронячы Беларусь ад варожых навалаў. Вызначаліся татары і працавітасцю, уменнем як земляробы-агароднікі апрацоўваць гэтую зямлю і мець з яе добры плён. А хіба не істотны іх уклад і ў нашу пісаную гісторыю і культуру славутымі "Аль-Кітабамі", створанымі арабскай вяззю, але жывой і сакавітай беларускай мовай, якая ўжо даўно для колішніх выхадцаў з Крымскага ханства стала роднай.

Ад імя нашчадкаў аўтара неперäўзыдзенага шэдэўра, паэмы "Новая зямля", сказаў слова сын Якуба Коласа, доктар фізіка-матэматычных навук Міхась Міцкевіч. Ён, дарэчы, у свой час паслужыў бацьку прататыпам галоўнага героя падчас напісання кнігі для дзяцей "Міхасёвы прыгоды". Маючы адчувальны плён у абсягах дакладных навук, Міхась Канстанцінавіч па складу характару, па сваёй натуры — тыповы лірык, у побыце, як і бацька, чалавек без аніякай фанабэрыі, просты, мудры і шчыры. А яшчэ і паэт у душы, што было засведчана і раскошным, з густам афармленым букетам кветак, і ўласнымі вершаванымі радкамі.

Тое, што кніга стваралася Разаліяй Александровіч і Таццянай Нескаромнай у добрай згодзе, падкрэслівалася неаднойчы. А яшчэ Разалія Александровіч казала пра тое, што ідэя такога выдання нарадзілася даўно, калі яна спачатку звыш дзесяці гадоў працавала ў дзіцячым саду № 266, а потым у адзіным на той час беларускамоўным садзіку пад кіраўніцтвам Галіны Прымы. На прэзентацыі прысутнічалі загадчыца сада № 266 Любоў Алексяюк і яе намесніца Антаніна Каўшавацкая, якія прыйшлі сюды разам са сваімі цяперашнімі выхаванцамі, што надало мерапрыемству асаблівую эмацыянальнасць.

Удруку ўжо з'явіліся водгукі на гэтае выданне. Аўтар аднаго з іх, літаратар і да нядаўняга часу супрацоўнік выдавецтва "Народная асвета" Яўген Гучок узнёсла назваў свой допіс "Шэдэўр для маленькіх". Правамерна адказаць на пытанне, у чым прычына бясспрэчнага поспеху, ды паставіць гэтую кнігу ў адпаведны кантэкст.

Найперш, зыходзячы з пераклічкі назваў, згадваецца славутая "Зямля пад белымі крыламі" Уладзіміра Караткевіча, які першым адчуў патрэбу расказаць выразнай і даходлівай мовай маладому пакаленню пра сваю найпершую і найбольшую любоў — Беларусь. На гэтай кнізе, якая з'явілася ў той час, калі ў школьных падручніках гісторыя Беларусі падавалася выбарачна і вымарачна, выхавалася шмат сапраўдных беларусаў. Некалькі разоў перавыдадзеная, яна разышлася імгненна. Такі ж шчаслівы, хоць і вельмі нялёгкі лёс кнігі Уладзіміра Арлова "Адкуль наш род", дзе паслядоўна выкладаюцца падзеі беларускай гісторыі ад Полацкага княства да пачатку нашага стагоддзя. У гэтым жа кантэксце стаіць і кніга Кастуся Тарасава "Беларусь", прызначаная для старэйшага вучнёўства.

Як бачым, "Зямля з блакітнымі вачыма" не на голым месцы ўзнікла. Але заняла сваю дасюль не запоўненую нішу. Каб не паўтараць ад сябе сказанае іншымі, прывяду тут цытату з водгуку ("Книжный мир", 2001) Яўгена Гучка: "*З 24 раздзелаў выдання чытач даведаецца пра гісторыю нашай зямлі, яе жыхароў, маляўнічы свет прыроды, яе непаўторную архітэктуру, старажытнае наша пісьменства і многае іншае (усяго не пералічыш). Вельмі ўдала распрацаваны метадычны апарат (пытанні, заданні, звароты, парады, вершы, слоўнічак і г. д.), які дапамагае ўцягваць, уключаць маленькіх грамадзян да ўдзелу ў жыцці іх Радзімы. Кожная старонка напісана прачула, захапляюча, сакавітай мовай, сапраўды па-беларуску...*"

З прыведзенай цытаты бачна, што тэматычны абсяг "Зямлі з блакітнымі вачыма" значна шырэйшы за змест кніг У. Арлова і К. Тарасава, дзе падаецца гістарычная панарама важнейшых падзей і асоб нашай Бацькаўшчыны.

Узаключэнне колькі ў гэтым выпадку абавязковых слоў пра мастацкае афармленне. Бо без сапраўды эмацыянальна ўражлівых ілюстрацый кнігі для дзяцей проста не існуе. Таму трэба аддаць належнае рэдакцыі мастацкага афармлення выдавецтва "Беларусь", дзе гэта кніга выйшла. За тое, што яны здолелі падабраць калектыў мастакоў у складзе Наталлі Егеравай, Віктара Жахаўца, Ганны Нікіцінай і Вольгі Пачкаевай. Кожны з іх працаваў на сваёй дзялянцы (Егерава, апрача гэтага, рабіла і макет), але ўражання чагосьці падобнага на эклектыку ці разнастылёвасць няма. Кажу гэта і з улікам уласнага вопыту: пару гадоў назад меў намер у выдавецтве "Бацькаўшчына" выдаць "Зямлю з блакітнымі вачыма", але для аднаго мастака праілюстраваць такі разнапланавы матэрыял было амаль немагчыма, а вось сабраць і зацікавіць часовы творчы калектыў я проста не здолеў.

Прэзентацыя кнігі ладзілася супольна Літаратурным музеем і Згуртаваннем беларускіх татараў, ад імя якога слова мелі такія аўтарытэтныя людзі, як Абу-Бікір Шабановіч і Ібрагім Канапацкі. А пра свой абавязак перад кроўнымі братамі, якія жывуць на гэтай зямлі і з'яўляюцца, захоўваючы свае традыцыі, часткай беларускага народа, Разалія Александровіч сказала, што ў яе планах напісанне кнігі такога ж накірунку пра гісторыю пасялення і сужыцця татараў на Беларусі. Застаецца толькі пажадаць плённага здзяйснення задуманага!

**Яўген ЛЕЦКА.**

ХРЫСЦІЯНСКАЯ СТАРОНКА «ЖЫЦЦЁ І ВЕРА»



# ДОМ МІЛАСЭРНАСЦІ Ў ПІНСКУ





У кожнага чалавека ў жыцці бываюць абставіны, калі яму, як паветра, неабходны падтрымка, спагадлівасць і душэўная цеплыня. І ў першую чаргу гэта тычыцца тых, каго лёс абдзяліў сваёй увагай — людзей хворых і адзінокіх. Каб дапамагчы ім перасіліць цяжкую сітуацыю, даць жыццёвую ўпэўненасць, і быў створаны ў 1994 годзе ў Пінску Дом міласэрнасці. Невялікі, разлічаны ўсяго на дваццаць месцаў, пабудаваны ён на ахвяраванні людзей, неабыякавых да чалавечых пакут. Збор сродкаў і будаўніцтва Дома міласэрнасці ажыццявіла старшыня гарадской арганізацыі Чырвонага Крыжа Вольга Жукава.

Гэты дом стаў прытулкам для адзінокіх інвалідаў, якія трапілі ў складаныя ўмовы і якім патрэбны догляд. Сярод іх — адзінокія пасляаперацыйныя хворыя, беспрытульныя старыя перад аддаваннем у інтэрнат, тыя састарэлыя людзі, што раптам засталіся без апякунства. Тут яны жывуць на працягу аднаго-трох месяцаў у залежнасці ад таго, як вырашаецца тая экстрэмальная сітуацыя, у якой яны апынуліся.

А даглядаюць пастаяльцаў адзінаццаць сясцёр міласэрнасці — маладыя жанчыны, для якіх чужы боль — іх боль. Трэба бачыць, як са шчырай цеплынёй адносяцца яны да сваіх падапечных і як удзячныя ім абяздоленыя людзі. За сем год свайго існавання Дом міласэрнасці прытуліў больш за 700 чалавек. Для многіх ён застаўся тым месцам, куды заўсёды можна завітаць і атрымаць падтрымку.

Нядаўна, у час свайго візіту ў Беларусь, Дом міласэрнасці ў Пінску наведаў Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II, які падзякаваў сёстрам міласэрнасці за нялёгкую працу, а іх падапечным пажадаў духоўнай мужнасці і веры ў жыццё.

НА ЗДЫМКАХ: Свяцейшы Патрыярх Аляксій II з сёстрамі міласэрнасці і іх падапечнымі; з былым партызанскім разведчыкам Альбертам БАРАНОЎСКІМ гутарыць сястра міласэрнасці Таццяна САЧКОЎСКАЯ; сёстры пінскага Дома міласэрнасці.

Тэкст і фота
**Яўгена КАЗЮЛІ.**

МІЖЦАРКОЎНАЯ ДАПАМОГА

# СЯБРОЎСКІ ДЫЯЛОГ КАНФЕСІЙ

***Беларусь — традыцыйна шматканфесійная краіна, здаўна тут суседнічалі праваслаўныя, католікі, уніяты, пратэстанты, іудзеі, мусульмане. Былі ў яе гісторыі трагічныя моманты рэлігійных канфліктаў, у наш жа час прадстаўнікі хрысціянскіх канфесій імкнуцца весці сяброўскі дыялог, сумесна ажыццяўляць аказанне дапамогі немаёмным і абяздоленым жыхарам краіны.***

6—7 чэрвеня 1997 года ў Мінску адбылася ўстаноўчая канферэнцыя "круглага стала" па міжцаркоўнай дапамозе ў Беларусі, дзе прынялі ўдзел прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы (Маскоўскі патрыярхат), Саюза ЕХБ (Евангельскіх хрысціян баптыстаў) Беларусі, Біблейскага таварыства Беларусі, Лютэранскай абшчыны Мінска і офіса па справах Усходняй Еўропы Сусветнага савета цэркваў (ССЦ).

У выніку працы асамблеі былі зацверджаны структура і паўнамоцтвы "круглага стала", склад і абавязкі савета, праўлення і офіса "круглага стала". Прыярытэтнымі накірункамі дыяканічнай дзейнасці "круглага стала" былі вызначаны: дапамога тым, хто пацярпеў ад аварыі на ЧАЭС, праблемы асветы і адукацыі, сацыяльная рэабілітацыя і медыцынская дапамога абяздоленым і тым, хто мае патрэбу, у тым ліку зняволеным і немаёмным.

"Круглы стол" па міжцаркоўнай дапамозе ў РБ — гэта форум, заснаваны хрысціянскімі цэрквамі ў Беларусі ў супрацоўніцтве з Сусветным саветам цэркваў, у дзейнасці якога на падставе прынцыпу раўнапраўя і партнёрства прымаюць удзел прадстаўнікі Рускай праваслаўнай царквы, Евангелічнай лютэранскай царквы ў Беларусі, Саюза евангельскіх хрысціян баптыстаў, іншых царкоўных арганізацый, а таксама замежных агенцтваў-партнёраў па міжцаркоўнай дапамозе. З арганізацыяй "Caritas", якая прадстаўляе Рымска-каталіцкую царкву, вядуцца перамовы на тэму статуса яе ўдзелу ў "круглым стале". У склад Савета "круглага стала" ў Беларусі ўвайшоў і Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

На працягу 2000 года "круглы стол" актыўна супрацоўнічаў у Беларусі з 88 арганізацыямі-партнёрамі асноўных хрысціянскіх канфесій. Першыя пілатажныя праекты, якія ажыццявіла Брацтва Трох Віленскіх мучанікаў, былі накіраваны на магчымасць стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы "круглага стала" па міжцаркоўнай дапамозе ў РБ. Асноўным праектам гэтага накірунку стаў праект "Дом міжцаркоўнага супрацоўніцтва "Кінокія", які атрымаў права на існаванне і ажыццяўляецца, дзякуючы падтрымцы сацыяльнай структуры Евангелічнай царквы Германіі Diakonisches Werk. У сценах Дома "Кінокія" з зімы 1999 года праводзяцца хрысціянскія сустрэчы, семінары, пасяджэнні "круглага стала" ў РБ, заняткі з дзецьмі-інвалідамі, тут маюць магчымасць спыніцца іншагароднія прадстаўнікі хрысціянскіх арганізацый Беларусі. Хутка Дом міжцаркоўнага супрацоўніцтва стане шматфункцыянальным цэнтрам, які дазволіць падняць узровень міжканфесійнага дыялога ў Беларусі на новую ступень развіцця.

У 2001 годзе ў дзейнасці "круглага стала" з'явіцца новая праграма — "Аказанне дапамогі зняволеным, нарказалежным, ВІЧ-інфіцыраваным, бяздомным".

З'яўленне новай праграмы звязана з неабходнасцю аказання дадатковай дапамогі пералічаным катэгорыям грамадзян. Турмы Беларусі перапоўнены, што ўскладняе ўмовы ўтрымання зняволеных. Не хапае медыкаментаў, прадуктаў харчавання. За апошнія некалькі гадоў рэзка павялічылася колькасць ВІЧ-інфіцыраваных зняволеных. У сувязі з гэтым у месцах пазбаўлення волі ствараюцца лакальныя зоны для ВІЧ-інфіцыраваных. У 2001 годзе "круглы стол" мяркуе аказаць дадатковую дапамогу асобам, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, у выглядзе медыкаментаў, дэзінфіцыруючых сродкаў, прадуктаў харчавання, прадметаў асабістай гігіены.

Як паказваюць статыстычныя даныя, пастяннае павелічэнне колькасці ВІЧ-інфіцыраваных (асабліва сярод нарказалежных) у Беларусі патрабуе неадкладнага прыняцця дзейсных мер і актыўнага ўмяшальніцтва работнікаў адукацыі, сацыяльных службаў і розных грамадскіх аб'яднанняў з мэтаю прадухілення далейшага развіцця тэндэнцыі, якая ставіць пад пагрозу здароўе беларускай нацыі. На перыяд з 2000 па 2003 год "круглы стол" прапаноўвае праграму-праект "Аказанне дапамогі ВІЧ-інфіцыраваным, прафілактыка ВІЧ-інфекцыі і СНІДу".

Пасля чарнобыльскай трагедыі з'явілася шмат арганізацый і ўстаноў, дзейнасць якіх так або інакш звязана з аказаннем дапамогі ахвярам гэтай катастрофы. Беларускі "круглы стол" па міжцаркоўнай дапамозе таксама не застаўся ў баку ад гэтай праблемы. Размеркаванне сацыяльнай дапамогі праз царкоўную структуру вельмі эфектыўнае, таму што менавіта ў царквы абяздоленыя людзі просяць абароны. Тут малаверагодна, што дапамога пападзе выпадковым людзям. Прыкладам такой працы з'яўляецца праект "Народная аптэка", які ажыццяўляе Свята-Ефрасіннеўскі прыход пасёлка Івянец Мінскай вобласці. На тэрыторыі пасёлка пастаянна назіраецца павышаны ўзровень радыяцыі, здароўе жыхароў паслаблена. З 1996 года свяшчэннікам Віктарам Перагудавым ажыццяўляецца праект па аказанні медыцынскай дапамогі маламаёмаснаму насельніцтву, што пражывае на забруджанай тэрыторыі Мінскай вобласці: адкрыта бясплатная аптэка, створаны запас лекавых раслін. Зараз праект мае добрыя перспектывы для самаразвіцця, плануецца адкрыццё дома апекі для адзінокіх састарэлых жыхароў гарадскога пасёлка Івянец і навакольных вёсак.

Значная частка сацыяльна-дыяканічных праектаў "круглага стала" рэалізуецца праваслаўнымі сястрыцтвамі. Сёстры даглядаюць хворых, састарэлых, інвалідаў, сірот, аказваюць ім медыцынскую і прадуктовую дапамогу, арганізоўваюць святы, працуюць у дабрачынных майстэрнях, аказваюць духоўную і маральную падтрымку.

У планы дзейнасці "круглага стала" ўваходзіць стварэнне працоўных месцаў і самаакупныя праекты па стварэнню аграпрамысловых прадпрыемстваў, якія вырабляюць сельскагаспадарчую прадукцыю, сталярных і швейных майстэрняў.

У параўнанні з 2000 годам у 2001-м колькасць праектаў па данай праграме значна павялічыцца.

ЗДАРЭННІ

### НАСТАЯЦЕЛЬ СВЯТА-МІКАЛЕЎСКАГА САБОРА БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ ПАПЯРЭДЗІЎ ГРАМАДЗЯН АБ АШУКАНСТВЕ

З просьбай не даваць грошы для аднаўлення храма незнаёмым людзям да жыхароў Брэста праз мясцовы друк звярнуўся айцец Ігар, настаяцель Свята-Мікалаеўскага гарнізоннага сабора, што знаходзіцца ў Брэсцкай крэпасці.

Як гаворыцца ў звароце, "калі вы жадаеце ахвяраваць на аднаўленне храма, прыносьце ў царкву, а не давайце ўсялякім зборшчыкам, паколькі ад нашага храма нікому не дадзена благаславенне на такія зборы".

Свяшчэннік звярнуўся з просьбай аб усіх заўважаных зборшчыках ахвяраванняў на Свята-Мікалаеўскі сабор паведамляць у міліцыю, таму што без благаславення храма гэтым займаюцца толькі ашуканцы.

**Алена РУДЗЬ.**

ВЫСТАВЫ

### ЯГО КАРЦІНА — ІКОНА

Выстава адной карціны, аўтар якой — выкладчык выяўленчага мастацтва гарадской сярэдняй школы № 19 Валерый Казлоўскі, адбылася ў Гомелі. Тры гады з захаваннем усіх канонаў і пастоў працаваў былы выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута, каб стварыць у стылі маркетры, дзе стыкуюцца каля тысячы розных дэталей з бяросты, ікону Прасвятой Багародзіцы Іверскай Божай Маці. Перад экспазіцыяй ікона была асвечана ў царкве.

НА ЗДЫМКУ: Валерый КАЗЛОЎСКІ са сваёй карцінай-іконай.

Фота **Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА**, БелТА.



ЖЫЦЦЁВЫЯ СЮЖЭТЫ

*Калі людзі сталеюць, іх пачынаюць турбаваць успаміны. Вось настаў гэты час і для мяне. Захацелася прыгадаць тое, што адбывалася больш за 40 гадоў назад.*

# Настаўніца з-пад Нясвіжа

...Мая бабуля жыла ў вёсцы са смешнай назвай Казлы. Калі мне было каля чатырох гадоў, тата паступіў вучыцца ў духоўную семінарыю ў Жыровіцах, мама працавала, пра дзіцячы сад і марыць не прыходзілася, і нас з сястрой аддалі бабулям-дзядулям. Малодшая сястрычка жыла ў маміных бацькоў у мястэчку Цімкавічы, дзе дзядуля Дзмітрый служыў свяшчэннікам, а мяне адвезлі ў вёску Казлы недалёка ад Нясвіжа.

Памятаю бабуліну хату: земляная падлога, па якой днём і ноччу гулялі куры, вялікая печ, драўляны ложак, стол і дзве шырокія лавы ў куце пад іконамі, два куфэркі (вялікі і малы), кухонная шафа і невялікая перанасная лаўка. Яшчэ — калаўрот у куце. Вось і ўся абстаноўка, звычайная для многіх вясковых хат таго часу. А яшчэ ў бабулі жыла пастаяліца — настаўніца. Яна спала на лаве пад іконамі. Мяне клалі спаць на куфры. Пра гэту настаўніцу я і хачу напісаць.

...У хаце пад столлю вісела газавая лямпа. Памятаю пах газы, змешаны з пахам самасаду. Дзядуля Вінцусь, татаў айчым, шмат курыў. Тытунь ён вырошчваў сам, сушыў яго, потым наразаў і рабіў самакруткі. Чад стаяў невыносны. Бабуля і настаўніца сварыліся на яго, а як мне, дык вельмі падабаўся пах дзядулінага тытуню! Дарэчы, настаўніца хоць і не вітала дзедаву звычку, але старыя сшыткі для самакрутак давала. Больш таго: мы з ёй нават дапамагалі дзядулі іх майстраваць. У яе атрымлівалася лепш, чым у мяне.

Увечары да бабулі прыходзілі жанчыны з калаўротамі, пралі пражу, настаўніца правярала каля лямпы сшыткі. Калі яна заканчвала працаваць, жанчыны пачыналі расказваць розныя гісторыі, падобныя на казкі, часам спявалі.

Потым настаўніца пераехала на іншую кватэру: у нашай вясковай хаце ўсё ж было мала месца для трох дарослых і аднаго дзіцяці. Аднак да нас, як мне зараз здаецца, заходзіла даволі часта. Ва ўсялякім выпадку, я добра памятаю, як яна вучыла мяне гаварыць літару "р": "Ну якая ж ты Лёлечка, ты Лорачка. Скажы "рама", "ровар", "Лора"... І я навучылася гаварыць: "рама", "ровар", "Лора"...

Не ведаю, чаму, але ў вёсцы, калі заходзілі ў хату, не прынята было здымаць вопратку. Памятаю, у настаўніцы была прыгожая белая пуховая хустка і цёмнае паліто. Не футра, а менавіта паліто. Вось яна заходзіць да нас у хату, садзіцца на лаву, і пра нешта ціха размаўляе з бабуляй. Яны гавораць доўга. І мне таксама хочацца пагаварыць, але дзецям нельга ўмешвацца ў гутарку дарослых. Я залажу на лаву і гладжу хустку настаўніцы. Яна мяккая, як коцік. Бабуля не дазваляе гладзіць хустку, каб не вымазала. Настаўніца бярэ мяне на рукі, я ціхенька заміраю, гутарка працягваецца...

Калі бабуля ішла на працу, мяне адводзілі ў школу. Гэта была першая школа ў маім жыцці. У класе радамі стаялі парты — усяго чатыры рады. На кожным радзе сядзела па класу: першы рад — першы клас, другі — другі клас і гэтак далей. На ўсе чатыры класы — адна настаўніца, мая першая, незабыўная. Праз шмат гадоў пасля заканчэння універсітэта я нейкі час працавала ў школе, выкладала гісторыю. І толькі тады змагла ацаніць, што гэта за праца! І справа не ў тым, што цяжка ўтаймоўваць дзяцей. Іх жа трэба навучыць пісаць, чытаць, маляваць... Выказваць свае думкі, нарэшце. Прычым, чатыры класы ў адным памяшканні... А тут яшчэ дзіця прывялі, якому таксама патрэбна ўвага, якое трэба нечым заняць. Настаўніца давала мне паперу, часцей за ўсё вокладку ад сшытка і аловак. І я малявала рысачкі і кружочкі. А калі дзеці адказвалі ўрок, таксама ўзнімала руку. Тады настаўніца выклікала мяне да дошкі прачытаць вершы ці спець песеньку. І ставіла адзнаку. Такім чынам я была сапраўднай вучаніцай. Добра мне пачувалася ў школе, утульна. Самым вялікім страхам было ўбачыць бабулю, якая магла забраць мяне з урока, не дачакаўшыся перапынку.

Не памятаю, каб настаўніца хоць раз павысіла голас. Яна заўсёды гаварыла ціха. І амаль не ўсміхалася.

У вёсцы я вельмі сумавала па бацьках, асабліва па маме. Той, хто ў раннім дзяцінстве надоўга заставаўся без маці, мабыць, памятае гэта шчымлівае пачуццё тугі. Але побач з настаўніцай гэтае адчуванне праходзіла, мне рабілася спакойна. Вось і ўсё, што памятаю: белы пуховы платок, ціхі голас, вочы (баюся памыліцца, але, здаецца, шэра-блакітныя).

...Праз шмат гадоў я выпадкова даведалася, што маёй першай настаўніцай была маці айца Аляксандра Надсана. Пра гэта сказаў мой далёкі сваяк і вельмі добры чалавек, на жаль, зараз ужо нябожчык, Дзмітрый Акулік, які разам з айцом Аляксандрам ездзіў у Казлы на магілку настаўніцы.

Памерла мая бабуля, памёр тата. Пахаваны яны побач адно з адным на вясковых могілках. І кожны раз, калі прыязджаю да іх, спрабую знайсці і магілку настаўніцы. Хаця дакладна не ведаю: можа, яна ляжыць на іншых могілках. Але, на ўсялякі выпадак, хаджу паміж магіл і шукаю...

*...Нядаўна спытала ў сваёй траюраднай сястры, ці памятае настаўніцу? Так, памятае: "Ты пытаешся пра тую, што жыла ў бабы Фані? Яна ж была арыстакратка. Выкладала замежную мову. І ўсё жыццё шукала сына. Не ведаю, ці знайшла..."*

**Ларыса КАРАЧУН.**

КРАЯВІДЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ



<u>Ніна ЗАХАРЭВІЧ</u>

**ГОЛАС РАДЗІМЫ**

*Голас Радзімы...*
*Крык жураўліны*
*Цягне, як нітку, касяк.*
*Покліч журботны*
*Птушак балотных*
*Нам не забыць аніяк.*
*Голас Радзімы*
*Горкі ад дыму*
*Спаленых вёсак і сёл,*
*Плач-галашэнне,*
*Нас на маленне*
*Кліча царква і касцёл.*

*Голас Радзімы*
*Ў песнях любімых*
*Даўніх, мінулых гадоў,*
*Вёсен гуканне,*
*Мілых прызнанні*
*І памінанне дзядоў.*

*Голас Радзімы,*
*Дзе б ні былі мы,*
*Чуецца часта і ў сне,*
*І ва ўспамінах —*
*Хто што пакінуў*
*Там, у далёкай вясне...*

*г. Паставы,*
*Віцебская вобласць.*

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

ДАЙДЖЭСТ

# ЦІКАВАСЦЬ ДА КЛІМАТУ



### *БЕЛАРУСКІ ПІСЬМЕННІК ВАСІЛЬ БЫКАЎ ГОД ЖЫВЕ І ПРАЦУЕ Ў ФРАНКФУРЦЕ-НА-МАЙНЕ*

Увесь час натыкаешся на нешта новае, што сведчыць пра тое, як жа змяніўся час. Можна было падумаць, што беларускі пісьменнік Васіль Быкаў, аўтар дваццаці пераведзеных на нямецкую мову кніг, у Германіі належыць да ліку найбольш вядомых сучасных пісьменнікаў. Аднак знайсці яго творы аказалася складаней, чым можна было чакаць: у продажы не было ні адной з дваццаці кніг, а адшукаць іх у бібліятэках удалося толькі ў новых федэральных землях.

УЗ'ЯДНАННЕ Германіі і ў літаратуры прывяло да радыкальных перамен, якія ўцягнулі ў свой вір нават такіх пісьменнікаў, успрыняцце якіх у прынцыпе не павінна было перайначвацца. Адзін з іх — Васіль Быкаў. Хаця ён зараз жыве ў Германіі і часам выступае публічна, ён, хоць некалі і выдаваўся ва Усходняй Германіі, мала каму вядомы на сучаснай літаратурнай сцэне, перш за ўсё на Захадзе. Магчыма, хутка сітуацыя зменіцца, бо спачатку мінулага года Васіль Быкаў з жонкаю жыве ў Германіі. Са студзеня ён — у Франкфурце-на-Майне, дзе прадаставілі яму права на пражыванне на адзін год у рамках праграмы "Гарады прытулку". Франкфурт увайшоў у Міжнародную сетку "Gities of Asylum", якая ўключае зараз 30 гарадоў, вясною 1998 года. "Па праўдзе кажучы, я не лічу сябе пісьменнікам у выгнанні, — гаворыць Васіль Быкаў, калі яму задаюць адпаведныя пытанні, — я проста прыняў запрашэнне горада". Знаходжанне аплочваецца самым буйным у свеце "Франкфурцкім кніжным кірмашом", што адкрываецца ў Франкфурце-на-Майне кожны год у кастрычніку.

МЫ СУСТРЭЛІСЯ з Васілём Быкавым у невялікай, сціпла абстаўленай кватэры ў цэнтры Франкфурта, каб пагаварыць пра яго мэты і намеры ў сувязі са знаходжаннем у Федэратыўнай Рэспубліцы. "Больш за ўсё ў Германіі мяне цікавіць дэмакратычны клімат. І перш за ўсё для мяне важнае пытанне, як нямецкай нацыі ўдалося справіцца са сваім мінулым. Тут ёсць паралелі і з маёй радзімай. Але мне вельмі імпануе воля нямецкага народа справіцца са сваім мінулым". У сваёй творчасці Быкаў як ніхто іншы сканцэнтраваны на падзеях другой сусветнай вайны, і пры гэтым размова ў яго міжволі пастаянна ідзе пра Германію і немцаў. Здавалася б, тым самым ён павінен быў стаць — якраз пасля заканчэння халоднай вайны — па сутнасці, галоўным "будаўніком мастоў" паміж аб'яднанымі нямецкімі краінамі. Ва ўсялякім выпадку, кнігі Быкава яшчэ незадоўга да перамен узносіліся культурнай палітыкай ГДР як выдатнае сведчанне дзяржаўна санкцыянаванага "германа-савецкага сяброўства". Але менавіта гэтыя абставіны — разам з тым фактам, што толькі некаторыя чытачы і выдаўцы аказаліся здольнымі без прадузятасці ацаніць якасць літаратурных прац Быкава — прывялі да замоўчвання яго кніг і да маўчання вакол яго персоны, што яўна не адпавядае іх мастацкаму значэнню.

АЛЕ ПІСЬМЕННІК, які шмат пабачыў за свае 77 гадоў, адносіцца да гэтага без абурэння. Па яго прызнанню, ён рады ўжо таму, што можа без турбот працаваць у Франкфурце, бо ў яго яшчэ ёсць творчыя задумы, і іх літаратурнае ўвасабленне патрабуе сканцэнтраванасці і спакою. Гаворка ідзе пра аўтабіяграфічны твор, які ў любым выпадку павінен быць пачаты ў Франкфурце. У ім таксама будзе шмат напісана пра Германію, таму што і сам Быкаў як асоба сфарміраваўся пад уражаннямі вайны з Германіяй. Аднак не меншае ўражанне зрабілі на яго воля да прымірэння і здольнасць да крытычнага самааналізу, праяўленыя такімі людзьмі, як Генрых Бёль і Вілі Брандт. "Мы ж і самі знаходзімся ў такой сітуацыі, калі проста абавязаны непрадузята паглядзець на нашу краіну і гісторыю, — гаворыць ён і згадвае пра тое, як Вілі Брандт устаў на калені перад манументам ахвярам варшаўскага гета. — У прынцыпе, сучасным палітыкам Беларусі і Расіі таксама трэба было б здзейсніць аналагічны па моцы сімвалічны акт пакаяння за памылкі іх папярэднікаў, каб на маёй радзіме магла, нарэшце, пачацца плённая дыскусія аб уласнай гісторыі".

ПАЎПЛЫВАЎ НА ЯГО і Генрых Бёль, з якім Быкава звязвае глыбокая біяграфічная роднасць: у час вайны яны ў адзін і той жа час удзельнічалі ў баях у Малдавіі (праўда, не сустракаліся). У 1983 годзе ён упершыню асабіста пазнаёміўся з лаўрэатам Нобелеўскай прэміі на кангрэсе пісьменнікаў у Кёльне, і яго ідэю пераадолення варожасці любоўю, заснаваную на інтэрпрэтацыі драмы "Рамэа і Джульета", Быкаў зразумеў менавіта так, як яна і была задумана: ён пачуў у ёй заклік да пераадолення халоднай вайны і прымірэння народаў. Ці не змянілася ў свеце сказанага яго творчасць за час знаходжання ў Федэратыўнай Рэспубліцы, пытаю я Васіля Быкава напрыканцы нашай гутаркі: "Я не ведаю, — гаворыць ён, — але мая жонка лічыць, што з таго часу, як мы жывем у Германіі, мае літаратурныя творы сталі больш добрымі і мяккімі ў ацэнках. Верагодна, гэта тлумачыцца тым, што тут я магу спакойна займацца сваёй любімай справай".

**Марцін ШААК.**
("Deutschland").

ВАНДРОЎКА

# БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА





Дзяржаўны нацыянальны парк "Белавежская пушча" — любімае месца адпачынку і турызму як беларусаў, так і гасцей замежжа. Толькі летась яго наведала болей трыццаці тысяч чалавек, для якіх арганізаваны экскурсіі не толькі ў музей і да вальераў, але таксама і ў самыя запаведныя куткі пушчы, дзе ўвачавідкі можна ўбачыць цудоўную некранутую прыроду.

**НА ЗДЫМКАХ:** будынак музея "Белавежская пушча"; прагулкі на брычцы вельмі папулярны ў турыстаў; цар пушчы — зубр. Яго можна пабачыць толькі праз сетку: на волі ён небяспечны; любімец наведвальнікаў — лось.

Фота **Рамана КАБЯКА**, БелТА.





КАЛЯНДАР: ЖНІВЕНЬ-2001

**22 жніўня спаўняецца 140 год з дня нараджэння Ігната БУЙНІЦКАГА (нарадзіўся ў 1861, вёска Палевачы Глыбоцкага раёна, памёр у 1917), беларускага акцёра, рэжысёра, тэатральнага дзеяча, стваральніка беларускага нацыянальнага прафесійнага тэатра.**

Скончыў Рыжскае землямернае вучылішча, вучыўся ў прыватнай драматычнай студыі ў Вільні. Працаваў каморнікам на Беларусі. У 1907 годзе стварыў у Палевачах аматарскі тэатр. У 1910-м тэатр стаў прафесійным і атрымаў назву "Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага". Падтрымліваў яго ўласнымі сродкамі. У 1910—11 гадах тэатр гастраляваў па Беларусі, двойчы выступаў у Пецярбургу, а таксама ў Варшаве на вечарах беларускай моладзі. Буйніцкі — пастаноўшчык большасці спектакляў Першай беларускай трупы. Ён упершыню вывеў "мужыцкі" танец на сцэну, як выканаўца і пастаноўшчык паказаў невычарпальныя магчымасці і прыгажосць беларускіх народных танцаў і песень. Як драматычны акцёр выступаў пераважна ў характарных ролях, умела выяўляў гумар і тонкую іронію.

Уціск царскага ўрада і матэрыяльныя цяжкасці вымусілі Буйніцкага ў 1913 годзе закрыць тэатр. У маі 1917 года быў адным з ініцыятараў арганізацыі Першага беларускага таварыства драмы і камедыі.

**Ларыса МІХАЛЬЧУК.**

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ Ў № 30

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ.** 1. Парада. 3. Сяўба. 7. Асалода. 9. Радок. 10. Фарба. 11. Мана. 12. Мара. 13. Сябар. 15. Луста. 18. Грукат. 20. Рэчыва. 21. Дрэва. 23. Сцюжа. 24. Камора. 25. Учынак. 27. Вярба. 30. Журавель. 31. Старшыня. 33. Лічэбнік. 36. Дрыгва. 37. Жыхар. 39. Сподак. 40. Кушнер. 41. Творчасць.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ.** 1. Парастак. 2. Дакор. 3. Спакуса. 4. Брама. 5. Хованкі. 6. Паша. 8. Скарга. 14. Бурштын. 16. Сыракваша. 17. Рэха. 19. Туга. 21. Дзюба. 22. Малпа. 23. Скронь. 26. Гушчар. 28. Лекі. 29. Катрынка. 31. Сурдут. 32. Шлях. 34. Кухар. 35. Гайно. 37. Жарт. 38. Спіс. 41. Яр.

КРЫЖАВАНКА АД Алега КУЛЬЧЫЦКАГА

## ПЕРАКЛАДЗІЦЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ.** 5. Жертва. 6. Тряпьё. 11. Название. 12. Жатва. 13. Искусство. 16. Голубизна. 17. Течение. 18. Щепка. 21. Подберёзовик. 22. Сударь, государь. 23. Клочок. 24. Пырей. 29. Узник. 30. Кисть (украшение). 31. Возвращение. 35. Междометие. 37. Пятно. 38. Кровать. 39. Продолжение. 40. Скоба (у двери).

**ПА ВЕРТЫКАЛІ.** 1. Охрана 2. Продажа. 3. Стропило. 4. Стужа. 7. Бабочка. 8. Сочувствие. 9. Ботва. 10. Свидетель. 14. Управление. 15. Предложение. 19. Лемех. 20. Магарыч. 25. Иго. 26. Совок. 27. Гончая (собака). 28. Заливной луг. 32. Вид. 33. Живодёр. 34. Туча. 36. Звезда.



ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫТАНКА

*Вось і лета сышло,*
*Адспявалі калоссі,*
*Цяжка нам заўважаць,*
*Як з'яўляецца восень.*

*Непрыкметна зусім*
*Прыплыве павуцінкай,*
*Гляне жоўтым лістком*
*З-пад зялёнай хусцінкі.*

Пятрусь БРОЎКА.

# ШЧОДРЫ ЖНІВЕНЬ

З першымі жнівеньскімі днямі адчуваецца набліжэнне восені. Здаецца, і лета яшчэ як лета. У лесе трава зялёная. І кветак шмат на палянах. Сонца таксама грэе па-ранейшаму шчодра і горача.

Жнівень — час уборкі ўраджаю, не выпадкова ў яго такая красамоўная назва. У першай палове заканчваецца жніво азімых. Нібы караблі ў бязмежным акіяне, плывуць у напрамку ангараў нагружаныя караваны машын з пшаніцай, ячменем, аўсом. Да канца месяца і грэчка паспявае. А там і на іншыя палі спяшацца трэба. На чарзе лён, бульба, капуста. Няма часу адлежвацца, трэба старанна сабраць усё, што вырашчана.

Не лянуюцца і дзікія жывёлы, таксама спяшаюцца напоўніць свае кладоўкі. Наперадзе доўгая зіма. Варта паклапаціцца загадзя. Пакрыху крадуць з палёў і цягаюць зерне ў глыбокія норкі мышы і землярыйкі. Пацукі таксама шчыруюць.

А вось большасць лясных жыхароў лічаць за лепшае жыць "сумленнай працай". Нават карысць пры гэтым прыносяць людзям. Сойкі і арэхаўкі без стомы збіраюць шышкі, арэхі і жалуды. Шукаючы для сваіх запасаў добрыя сховы, разносяць іх далёка ад месца збору і хаваюць у разнастайных укрыццях: пад карэннямі, у шчылінах глебы, сярод ламачча або проста ў мох ці густую траву. Арэхі, жалуды, насенне — улюбёны зімовы ласунак вавёрак. Таму старанныя звяркі назапашваюць гэтага дабра як мага больш. На шляху да сховаў частка сабраных імі пладоў, насення губляецца. А яны возьмуць і прарастуць на наступны год. І, такім чынам, вясной на закінутай пустцы з'явяцца парасткі арэшніку або клёнаў. А дуб рассейваецца наогул выключна ляснымі птушкамі.

Птушкі ўжо збіраюцца ў чароды. Першымі кіруюцца ў далёкі шлях ластаўкі, стрыжы, за імі — зязюлі, івалгі, гарыхвосткі. А новае пакаленне шпакоў выпрабляе піруэты пад наглядам "старой гвардыі", асвойваючы тонкасці "вышэйшага пілатажу". Вестуны вясны з усёй адказнасцю рыхтуюцца да цяжкіх і працяглых пералётаў.

Усё менш у паветры насякомых. Знікаюць матылі — крапіўнікі, лімонніцы, капусніцы, мухі-жыгалкі. Пчолы спяшаюцца зрабіць апошнюю важкую ношку. Яны збіраюць нектар на разгалістых кустах верасу, што абдаюць водарам дробных ліловых кветачак. Верасовы мёд хоць і гаркаваты, але асабліва каштоўны. Цёмна-жоўты, часам з карычнева-чырвоным адценнем, вызначаецца шчыльнай кансістэнцыяй і хутка згушчаецца дзякуючы багаццю бялковых рэчываў.

Больш працяглыя ночы нясуць прахалоду вадаёмам. Усё часцей выпадаюць туманы. "Цвіценне" вады спыняецца. Яна робіцца чысцейшай і больш празрыстай. У паводзінах рыб адзначаецца актыўнасць, у гэты перыяд яны добра бяруцца на вуду.

І, вядома, гэта час "царавання" грыбоў. Самы багаты на грыбы — жнівень. Тут усім вядомыя падасінавікі і падбярозавікі, лісічкі і рыжыкі, ваўнянкі і грузды, масляkі і шампіньёны. Па ўтрыманні мінеральных рэчываў грыбы сапернічаюць з фруктамі. У сушаных баравіках у два разы больш бялку, чым у ялавічыне, у тры разы больш, чым у рыбе. Экстракты і араматычныя рэчывы, што ўтрымліваюцца ў грыбах, павышаюць апетыт і станоўча ўплываюць на працэсы стрававання. А колькі асалоды збіраць грыбы!

Праўда, і аб ядавітых грыбах забывацца нельга, трэба ведаць іх "у твар". Гэта найперш бледная паганка на высокай ножцы з пласцінкамі знізу, усім вядомыя мухаморы, несапраўдныя апенькі, што адрозніваюцца цагляным адценнем, сатанінскія грыбы на шырокіх ножках, якія нагадваюць баравікі, але моцна сінеюць на зломе, некаторыя іншыя, але ўжо менш небяспечныя.

Не варта грэбаваць зялёнкамі, махавікамі, падрашэтнікамі, сыраежкамі... Пры ўмелым прыгатаванні яны таксама не будуць лішнімі на стале. Нават грыбы-дажджавікі — белыя пругкія шарыкі — ужываюцца ў ежу, яны смачныя і вельмі карысныя. Неяк у Чэхіі знайшлі дажджавік вагой чатырнаццаць кілаграмаў. А мы іх ігнаруем, часам і нагою збіваем. Можа, не варта?

**Вячаслаў СТОМА.**

«Голас Радзімы»

Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь; Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі; Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом "Радзіма".

РЭДАКЦЫЯ:
Намеснік галоўнага рэдактара **Галіна УЛІЦЁНАК.**
Адказны сакратар **Таццяна КУВАРЫНА.**
Рэдактар аддзела — член рэдкалегіі **Яўген ЛЕЦКА.**
Рэдактар аддзела **Алена СПАСЮК.**
Аглядальнік **Віктар МАЦЮШЭНКА.**
Спецыяльныя карэспандэнты **Яўген КАЗЮЛЯ, Алесь МЯСНІКОЎ, Нэлі ПРЫВАЛАВА.**
Рэдактар-перакладчык **Святлана КАРПУЧОК.**
Стыльрэдактар **Ірына КАЗЛОВА.**
Тэхнічны рэдактар **Данута РАКАВЕЦ.**

Наш адрас: 220005, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 213-31-97 (тэл.-факс), 213-32-80, 284-76-56, 213-37-82.

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голас Радзімы», не заўсёды супадаюць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 81.
Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Тыраж 2 016 экз.
Зак. 2104.
Падпісана да друку 20.8.2001 г. у 12.00.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку» (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).